и страхов и создание условий для их переноса в реальную жизнь.

В завершении занятий мы предлагаем проводить своеобразное подведение итогов, рефлексию того, что было на занятии для обеспечения условий плавного перехода из мира фантазии и игр в мир реальности. В конце каждого занятия также целесообразно проводить какое-либо коллективное упражнение, цель которого заключается в том, чтобы снять негативные переживания (которые могли остаться у ребенка после занятия), а также закрепление хорошего настроения в группе.

В завершение хотелось бы отметить, что преодоление негативных эмоциональных состояний не может быть ограничено только рамками специально организованной коррекционной программы. Во всех случаях, на наш взгляд, оптимальным будет введение, на первом этапе, специального блока заданий, направленных на перенос полученных умений, способов деятельности в повседневную жизнь, в деятельность всех кружков и секций досугового учреждения. И осознанная переориентация работы каждого досугового центра на полномасштабное использование потенциала досуговой деятельности в становлении и развитии личности каждого ребенка. Так как использование методов досуговой деятельности в работе по коррекции эмоциональных состояний является более эффективным, чем, например, фармакологическое лечение. Также досуговая деятельность является наиболее гуманным способом лечения, так как опирается на собственные ресурсы ребенка, позволяя ему раскрыться и актуализировать свой внутренний потенциал, выбрать наиболее оптимальные пути, средства и темпы общего развития. Нисколько не принижая значения других приемов коррекции, на наш взгляд, следует более активно использовать весь богатый потенциал досуговой деятельности в работе психологов, социальных педагогов как средства действенного личностного развития младших школьников.


1. Захаров, А. И. Как преодолеть страх у детей / А. И. Захаров. – М., 1989. – 204 с.
2. Обухова, Л. Ф. Детская (возрастная) психология : учебник / Л. Ф. Обухова. – М. : Роспедагентство, 1996 – 374 с.
3. Рожина, Л. Н. Развитие эмоционального мира личности / Л. Н, Рогожина. – Минск : Университетское, 1999. – 272 с.
4. Чистякова, М. И. Психогимнастика / М. И. Чистякова. – М. : Просвещение, 1990. – 216 с.
5. Якобсон, П. М. Психология чувств и мотивации / П. М. Якобсон // Избр. психол. труды. – М. : МПСИ, Воронеж НПО «МОДЕК», 1998. – 304 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ – УДЗЕЛЬНІКАЎ АМАТАРСКІХ МАСТАЦКІХ КАЛЕКТЫВАЎ ФАЛЬКЛОРНАГА КІРУНКУ


**Ражкова Л. Л.**

*кандыдат педагагічных навук, заг. кафедры беларускай народна-песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*



***Аннотация***. *В статье рассматриваются вопросы формирования национального самосознания подростков – участников художественных любительских коллективов, ориентированных на фольклор. Анализируется педагогическая и художественно-творческая*

*деятельность ансамблей с целью выявления факторов, которые сдерживают процесс формирования национального самосознания их участников. Определяются педагогические условия эффективного формирования национального самосознания участников таких коллективов.*

***Summary**. The article deals with the formation of national consciousness of teenagers – participants of artistic amateur groups focused on folklore. The pedagogical and artistic-creative activity of ensembles is analyzed with the purpose of revealing the factors that restrain the process of formation of the national self-consciousness of their participants. Pedagogical conditions of effective formation of national consciousness of participants of such collectives are determined.*

Сацыякультурная сфера, якая з'яўляецца самастойнай падсістэмай сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання, навучання і развіцця чалавека, у распаўсюджванні духоўна-культурных каштоўнасцей і іх актыўным творчым засваенні людзьмі, а таксама і ў ажыццяўленні педагагічнай карэкцыі паводзін мае значна больш магчымасцей за другія іституты сацыялізацыі. Бо гэтая дзейнасць здзяйсняецца ў вольны час і мае добраахвотны характар, характарызуецца воляй выбару і ініцыятыўнасцю, асабістай скіраванасцю і запатрабаваннямі асобы.

На мастацкае аматарства як на важную сферу функцыянавання фальклорных каштоўнасцей у наш час паказваюць В.Я. Гусеў, Э.Я. Аляксееў, Ю.М. Кулікоў і іншыя навукоўцы. Сцвярджаецца, што мастацкае аматарства застаецца незаменным у культурным працэсе вяртання каштоўнасцей фальклору ў жыццё нашых сучаснікаў, што яно застаецца амаль што адзінай сферай дзейнасці, дзе існуюць рэальныя магчымасці адраджэння фальклорных традыцый і маецца магчымасць рэалізацыі этнічнай самаідэнтыфікацыі яе ўдзельнікаў [1]. Аднак па дадзеных сацыялагічнага апытання, праведзенага Л.І. Міхайлавай, успрыманне фальклору як культуры этнасу, як культуры, увасабляючай у сабе характар народа, яго дух, успрыманне фальклору як сродку этнічнай самаідэнтыфікацыі выражана недастаткова – 9 % апытаных [2, с. 140]. Не ўспрымаецца фальклор і як спосаб баўлення вольнага часу, зносін і адпачынку – 6 % і 2 % адпаведна.

Згодна «Палажэнню аб самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь», фальклорнае аматарства павінна садзейнічаць не толькі гарманічнаму развіццю асобы ўдзельніка, але і захаванню, развіццю, прапагандзе традыцыйных каштоўнасцей уласнага этнасу. Спецыфіка дзейнасці такіх калектываў патрабуе ад удзельнікаў свядомых адносін да нацыянальнай спадчыны. Наш практычны вопыт паказвае, што ёсць пэўныя цяжкасці ў фарміраванні свядомых адносін удзельнікаў да этнічнай (нацыянальнай) спадчыны. Гэта з'яўляецца вынікам канфлікту ў самім руху фальклорнага аматарства: паміж мэтамі, задачамі, зместам, спосабамі дзейнасці, метадамі і атрыманымі вынікамі. У апошні час арганізаванае мастацкае аматарства ў Рэспубліцы Беларусь, трансфармавалася, значна змяніўшыся ў прадмеце, змесце і формах. Яму прыходзіцца цяжка выжываць у новых сацыяльна-эканамічных умовах, звяртацца да розных крыніц здабывання неабходных матэрыяльна-фінансавых сродкаў. У такой сітуацыі фальклор таксама становіцца таварам на рынку культурных паслуг, які нястомна «паляпшаюць» і «апрацоўваюць», каб ён набыў «таварны выгляд». Усё больш дзейнасць такіх калектываў абмяжоўваецца атрыманнем прадметнага прадукту і ўсё менш выхаваннем і развіццём саміх удзельнікаў сродкамі прадметнай дзейнасці.

На жаль, сёння ўжо нельга гаварыць аб тым, што арганізаванае мастацкае аматарства, якое спажывае фальклорныя каштоўнасці, само па сабе, толькі дзякуючы фальклорным творам, без мэтанакіраванага ўплыву, без стварэння адпаведных умоў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

здолее адкарэктаваць паводзіны ўдзельніка ў тым ліку і нацыянальныя, што вельмі яскрава паказалі эксперыментальные дадзеныя. Адказы ўдзельнікаў сведчаць аб тым, што значная іх частка не задумвалася аб сваім нацыянальна-этнічным быцці і абыякава ставіцца да нацыянальнай культуры. Веданне гэтымі падлеткамі ўзораў фальклорнай спадчыны абмяжоўваецца рэпертуарнымі песнямі і танцамі, а стаўленне да іх дэманструецца на ўзроўні «падабаецца» – «не падабаецца». Не ўсе ўдзельнікі фальклорных калектываў, якія выкарыстоўваюць у сваёй мастацкай дзейнасці элементы традыцыйнай нацыянальнай спадчыны, з павагай і любоўю ставяцца да ўласнай нацыянальнай мовы і нацыянальнай культуры. Але ў той жа час яны працягваюць наведваць заняткі ў гэтых калектывах.

Аналіз прычын неэфектыўнасці працы калектываў па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў аматарства фальклорнага кірунку мы пачалі з высвятлення ўмоў, якія стрымліваюць гэты працэс.

У выніку назіранняў за рэпетыцыйнымі заняткамі калектываў, што бралі ўдзел у эксперыменце, гутарак з кіраўнікамі гэтых калектываў і іх удзельнікамі, мы маем падставу канстатаваць, што працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў у фальклорных калектывах не арганізаваны. Вядзецца спантанна, інтуітыўна, ад выпадку да выпадку. Такім чынам, развіццё нацыянальнай самасвядомасці асобы ў фальклорна-сцэнічных калектывах адбываецца стыхійна без знешне накіраванага ўплыву (у ходзе яе практычнай дзейнасці) і абумоўлена самаразвіццём асобы ў пэўным этнасацыяльным асяроддзі.

Мастацкае аматарства з'яўляецца падсістэмай дзвюх вялікіх сістэм – мастацкай культуры і сферы вольнага часу і мае асаблівую прыроду (дваістасць усіх яе структурных кампанентаў). Маецца на ўвазе дваістасць сістэмы матываў дзеяння на аснове спалучэння мастацкіх і немастацкіх сацыяльна-псіхалагічных патрэбнасцей суб'екта; і дваістасць пазіцыі кіраўніка, як арганізатара педагагічнага і мастацкага працэсу; дваістасць самой дзейнасці, якая з'яўляецца адначасова і мастацка-творчай і педагагічнай; дваістасць вынікаў, якія звязаны са зменамі асабістых якасцей асобных удзельнікаў і сацыяльна-псіхалагічных характарыстык групы і са стварэннем пэўнага мастацкага прадукта [3, с. 150-151]. Таму, аналізуючы мастацка-педагагічны працэс калектываў з пункту гледжання яго магчымасцей у развіцці нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў, мы ўлічвалі гэтую складанасць педагагічнага і творчага працэсаў.

Кіраўнік фальклорнага гурта нясе вялікую нагрузку як арганізатар педагагічнага і мастацка-творчага працэсу. Таму ад яго асобы, яго прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў залежыць сама жыццядзейнасць усяго калектыву. Складанасць яго дзейнасці ў тым, што гэтыя два працэсы, педагагічны і мастацка-творчы, ён павінен спалучаць: педагагічны працэс трэба ажыццяўляць ў ходзе мастацкай дзейнасці наведвальнікаў калектыву, а каб мастацкі працэс пераўтварыўся ў педагагічны неабходна свядомая пастаноўка мэт, педагагічная логіка іх дасягнення.

Пры правядзенні вуснага апытання кіраўнікоў фальклорных калектываў мы высветлілі, што задачу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў свайго гурта ніводны кіраўнік перад сабой спецыяльна не ставіць. Адсутнасць такой задачы ў педагагічным працэсе калектыву яны матывуюць:

— адсутнасцю методык фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы ў аматарскіх калектывах мастацкай творчасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— абмежаваным часам заняткаў у гурце і вялікім аб'ёмам ведаў, уменняў і навыкаў, якія неабходна перадаць і выпрацаваць у наведвальнікаў гэтых аматарскіх гуртоў;

— актыўнай выканальніцкай дзейнасцю калектыву, з-за якой увесь час рэпетыцыйных заняткаў скіраваны на набыццё прафесіяналізму;

— з-за пашыранага меркавання, што тыя асобы, якія займаюцца ў фальклорных калектывах, звычайна не зведваюць праблем з нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй з-за ўплыву, які на іх аказвае гэтая спецыфічная дзейнасць (вывучэнне фальклорнай спадчыны).

Увогуле, прыблізна 90% кіраўнікоў мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку ў сваёй дзейнасці арыентуюцца на атрыманне толькі мастацкага прадукта (камерцыйнага ў наш час) і не звяртаюць належнай увагі на педагагічныя праблемы. Таму яны не ставяць перад сабой задачы дыягностыкі выхаванасці ўдзельнікаў калектываў. У дзейнасці кіраўнікоў аматарскіх калектываў адсутнічаюць якія-небудзь формы фіксацыі эфектыўнасці педагагічнага працэсу адносна фарміравання выхаванцаў.

Гэтая ж карціна пацвярджаецца і аналізам вучэбна-выхаваўчых планаў калектываў, якія з'яўляюцца адзінай формай планавання дзейнасці калектыву. У асноўным, гэтыя дакументы змяшчаюць пералік вывучаемых элементаў вакальнай тэхнікі, тэмы па музычнай грамаце. Недастаткова распрацаваны планы па мастацка-выхаваўчай рабоце ў калектывах. Сярод іх мы амаль не сустрэлі запланаваных тэм заняткаў, гутарак, сустрэч, наведвання выстаў, экспазіцый, якія б тычыліся нацыянальнай праблематыкі. Кола запланаваных тэм па вывучэнні песеннага фальклору абмяжоўваецца земляробчым календаром беларусаў. Між тым, у сваёй большасці вывучэнне каляндарнай паэзіі адбываецца не ў комплексе (усе абрадавыя цыклы на працягу года), а выбарачна, толькі той абрад, на матэрыяле якога калектыў на дадзены момант працуе (напрыклад, «Гуканне вясны» ці «Каляды»). Гэты абрад вывучаецца на працягу года, каб прадставіць яго на справаздачным канцэрце ансамбля. Да таго ж, намі было заўважана, што кіраўнікі калектываў, арыентаваных на фальклор, нават тады, калі распавядаюць на занятках аб народных святах, не выкарыстоўваюць прыём параўнання «мы – яны» (традыцыйнага беларускага свята з аналагічным святам іншай традыцыйнай нацыянальнай культуры).

В.Ю. Хацінец у сваім дысертацыйным даследаванні неаднаразова скіроўвала ўвагу на вялікай ролі кіраўніка падлеткавага калектыву ў развіцці нацыянальнай самасвядомасці выхаванцаў. Пад уплывам індывідуальнасці настаўніка ў дзяцей фарміруюцца адпаведныя ёй індывідуальныя якасці. Этнічная індывідуальнасць кіраўніка калектыву ва ўзаемадзеянні з аб'ектамі ці суб'ектамі этнічнага свету пранікае і ўзнаўляе ў іх асабістыя этнапсіхалагічныя асаблівасці, тым самым ажыццяўляе рэальныя змены ў іх індывідуальным свеце [4, с. 259-260]. Мы вызначылі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці не толькі кіраўнікоў фальклорных калектываў, але і студэнтаў кафедры беларускай народна-песеннай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія ў будучым стануць кіраўнікамі такіх калектываў, а некаторыя ўжо імі і з'яўляюцца. Вызначэнне ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці (малюнак 1) намі праводзілася па методыцы доктара псіхалагічных навук В.Ю. Хацінец [4].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ




Малюнак 1 – Узроўні сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў – будучых кіраўнікоў калектываў фальклорнага кірунка

На жаль, вынікі праведзенага вымярэння ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці кіраўнікоў фальклорых калектываў і студэнтаў – будучых кіраўнікоў такіх калектываў – сведчаць аб нізкім ўзроўні нацыянальнай самасвядомасці.

Аналізуючы ўзровень нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў і кіраўнікоў фальклорных калектываў, мы не заўважылі заканамернасці паміж узроўнем нацыянальнай самасвядомасці і іх узростам, прафесійным стажам. Высокі ўзровень сувязі назіраецца якраз паміж такімі структурнымі кампанентамі, як усведамленне псіхалагічных асаблівасцей уласнай нацыянальнай супольнасці і ўсведамленнем асабістых этнапсіхалагічных асаблівасцей. Выяўлены высокі узровень сувязі гэтых кампанентаў дазваляе адзначыць спецыфіку фарміравання нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў беларусаў, для якіх адзначаны працэс характарызуецца фарміраваннем спачатку сістэмы этнапсіхалагічных асаблівасцей сваёй нацыянальнай супольнасці, а толькі потым этнакультурных. Па заўвагах В.Ю. Хацінец гэта сведчыць аб тым, што на дадзеным этапе развіцця этнічнай супольнасці адбыўся зрух этнічнасці з вобласці этнічнай культуры ў псіхалагічную сферу і абумоўлены найперш накіраванасцю на іншакультуру (еўрапейскую), што вельмі характэрна для гуманітарных факультэтаў. Далей будуецца сацыяльна-псіхалагічная залежнасць асобы ад умоў нацыянальнага быцця, якая крысталізуецца ўжо ў нацыянальную ідэнтычнасць. Апошнім кампанентам фарміруецца ўсведамленне асабістай этнічнасці і этнічнасці ўсёй супольнасці, што нарэшце прыводзіць да фарміравання этнічнай карціны свету [4, с. 158]. У той жа час, узровень нацыянальнай самасвядомасці кіраўнікоў мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку залежыць ад «паглыбленнасці» кіраўніка ў фальклорную творчасць, ад таго, наколькі ён наблізіўся да разумення народнай традыцыйнай творчасці, наколькі яна стала для яго спосабам жыцця.

Даследаванне паказала, што нават тыя кіраўнікі, якія маюць высокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, не заўсёды здольны аптымальна наладзіць працэс фарміравання гэтага віду самасвядомасці асобы ў сваіх калектывах. Усе адзначылі складанасць выяўлення асноўных этапаў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў у межах фальклорнага гурта, у выбары форм і метадаў працы ў гэтым кірунку, цяжкасць у вызначэнні адпраўнога пункту працэсу фарміравання і развіцця нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў сваіх калектываў, а таксама адзначылі сваё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не вельмі дакладнае разуменне паняцця «нацыянальная самасвядомасць», што перашкаджае ўяўленню імі сабе шляхоў работы па яе развіцці. Але інтэрв'юіраванне кіраўнікоў калектываў фальклорнага кірунку дазволіла ўстанавіць, што менавіта кіраўнікі з высокім узроўнем сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці адчуваюць патрэбу ў мэтанакіраваным яе развіцці ў сваіх удзельнікаў, тады як кіраўнікі з нізкім узроўнем усю сваю ўвагу скіроўваюць на атрыманне камерцыйнага мастацкага прадукта.

Такім чынам, дадзеныя аналізу дзейнасці кіраўнікоў такіх калектываў паказваюць, што для ўдасканалення працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў гуртоў, у сваёй дзейнасці арыентаваных на фальклорную спадчыну, вельмі каштоўным будзе ўзмацненне іх прафесійнай падрыхтоўкі, дзе галоўным бачыцца фарміраванне найперш каштоўнасных, а не спажывецкіх адносін да фальклору. У выніку магчыма атрымаць і большае ўсведамленне нацыянальнага.

Наступнае наша меркаванне тычыцца арганізацыі самой мастацка-педагагічнай дзейнасці калектыву.

На нашу думку, праца ў такім калектыве па развіцці нацыянальнай самасвядомасці яго ўдзельнікаў будзе больш эфектыўнай, калі ў яго мастацка-педагагічным працэсе выхаваўчы патэнцыял фальклору знойдзе цэласную сваю рэалізацыю. Трэба надаць належную ўвагу не толькі інфармацыйнаму зместу твораў, але і імітацыі спецыфічных спосабаў функцыяніравання народнай традыцыйнай творчасці [5].

Як мы высветлілі, нацыянальная самасвядомасць індывіда развіваецца дзякуючы яго ўключэнню ў значную і нацыянальную па змесце дзейнасць. Мы вызначылі якое месца ў межах мастацка-педагагічнага працэсу аматарскага калектыву адводзіцца грамадска-карыснай дзейнасці. На першым месцы ўдзельнікі апытаных калектываў паставілі зносіны; вучэбна-творчая, альбо прадметная дзейнасць апынулася на другім месцы; творчая дзейнасць – на трэцім месцы, а пазнавальная і грамадска-карысная дзейнасць былі пастаўлены ўдзельнікамі на апошнія, адпаведна чацвёртае і пятае месцы. Як мы бачым, дзейнасць на карысць грамадству па захаванні і развіцці народнай традыцыйнай творчасці; яе прапагандзе і рэканструкцыі займае апошняе месца ў арыентацыі на дзейнасць удзельнікаў фальклорных калектываў. Арыентацыя на пазнанне фальклорных з'яў таксама займае адно з апошніх месцаў. Атрыманая намі карціна дзейнасных арыентацый тлумачыць нам, чаму нацыянальная самасвядомасць удзельнікаў нашых гуртоў значна адрозніваецца ад прагнозаў. Прычынай непажаданасці для асобы – удзельніка фальклорна-сцэнічнага калектыву такой дзейнасці як грамадска-карысная і пазнавальная, на наш погляд, з'яўляюцца недахопы ў яе арганізацыі, непрывабнасць яе для падлеткаў.

Таму для ўдасканалення працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў фальклорна-сцэнічных падлеткавых гуртоў мы лічым мэтазгодным фарміраванне станоўчых адносін да грамадска-карысных спраў у мастацка-адукацыйнай дзейнасці калектыву, якія маюць нацыянальную афарбоўку.

Такім чынам, для ўдасканалення працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў аматарскіх калектываў патрэбна выкананне наступных педагагічных умоў. Па-першае, у мастацка-педагагічным працэсе калектываў педагагічны патэнцыял фальклору не мае магчымасці цэласнай рэалізацыі, таму што не ствараюцца адпаведныя для гэтага ўмовы. У сваёй большасці кіраўнікі такіх калектываў звяртаюць увагу толькі на інфарматыўны бок фальклорных твораў, на іх тэкст, сюжэт, тады як існуе спецыфіка іх узнаўлення, функцыяніравання; фактары,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія таксама маюць сваё выхаваўчае ўздзеянне на асобу – гэта функцыянальнасць, традыцыйнасць, вуснасць і сінкрэтызм. На нашу думку, толькі тады, калі абодва гэтыя бакі фальклорнага твора будуць прадстаўлены ў творчай і педагагічнай працы калектыву, толькі тады мы атрымаем цэласны ўплыў фальклорнай спадчыны на асобу з мэтай фарміравання яе нацыянальнай самасвядомасці. Па-другое, самасвядомасць асобы фарміруецца і развіваецца толькі ў працэсе яе дзейнасці. Мы мяркуем, што грамадска-карысныя справы з нацыянальным зместам – гэта той шлях, які вядзе да аптымізацыі працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў фальклорна-сцэнічнага калектыву. І па-трэцяе, у сістэме мастацкага аматарства кіраўнік калектыву – ключавая фігура, ад адукацыі якой, ад прафесійных ведаў якога залежыць усё жыццё гурта, у тым ліку і развіццё нацыянальнай самасвядомасці выхаванцаў. Таму мы лічым неабходным звярнуць увагу на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці будучых кіраўнікоў аматарскіх калектываў фальклорнага кірунку ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Мяркуем, што семінары, курсы павышэння кваліфікацыі, публікацыі, метадычныя распрацоўкі па нацыянальнай праблематыцы дапамогуць вырашыць праблему ўдасканалення працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў фальклорных падлеткавых гуртоў.

1. Алексеев, Э. Е. Фольклор в контексте современной культуры: рассуждения о судьбах народной песни / Э. Е. Алексеев. – М. : Совет. композитор, 1988. – 236 с.

2. Михайлова, Л. И. Народная художественная культура: детерминанты, тенденции, закономерности социодинамики / Л. И. Михайлова. – М. : Вузовская книга, 2001. – 264 с.

3. Смирнова, Е. И. Художественная самодеятельность как социально-педагогическое явление : дис. … д-ра пед. наук : 13.00.05 / Е. И. Смирнова. – Л., 1989. – 488 л.

4. Хотинец, В. Ю. Этничность в интегральном исследовании индивидуальности человека: методология, теория, эмпирика и педагогическая практика. На материале исследования коренных народов Западного Урала : дис. д-ра психол. наук : 19.00.01 / В. Ю. Хотинец. – М., 2003. – 415 л.

5. Ражкова, Л. Л. Да пытання аб педагагічным патэнцыяле фальклору / Л. Л. Ражкова // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 3. – С. 46–49.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ОТРАЖЕНИЕ ТЕМАТИКИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ В СОДЕРЖАНИИ ВОЕННО-ИСТОРИЧЕСКОГО ТУРИЗМА КАК ФАКТОР ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ

**Рябова Е. В.**

*кандидат педагогических наук, заместитель директора по учебной работе гимназии № 61 г. Минска*

***Аннотация***. *В статье представлена классификация экскурсионных объектов военно-исторических маршрутов, отражающих тематику Великой Отечественной войны и направленных на патриотическое воспитание граждан на примере героического прошлого белорусского народа. Актуализируются сведения о новых музейных и мемориальных комплексах, обусловливающих повышение интереса к военно-историческому туризму.*

***Summary***. *The article presents a classification of excursion destinations reflecting the subject matter of the Great Patriotic War and aimed at the patriotic upbringing of citizens on the example of the heroic past of the Belarusian people. It actualizes the information on the new*